# КУРС НА ДЫНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

## ААТ «Чарлёна» з кожным годам узмацняе вытворчыя пазіцыі



**ГАСПАДАРКА створана шляхам аб'яднання трох суседніх калгасаў з цэнтрам у аграгарадку Лунна. Цяпер гэта даволі вялікае сельгаспрадпрыемства і адно з найбольш трывалых у Мастоўскім раёне. Амаль тры гады таму ААТ «Чарлёна» ўзначаліў Віктар КУЛІСЕВІЧ, яго працоўны стаж у галіне амаль 35 гадоў. Вопытны кіраўнік унёс сваё бачанне развіцця сельскагаспадарчага прадпрыемства, і гэта дало свой вынік. «Чарлёна» кожны год займае лідзіруючыя пазіцыі ў раённых спаборніцтвах. За высокія паказчыкі ў працы дырэктар акцыянернага таварыства нядаўна атрымаў Падзяку ад кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. Ганаровы ліст быў уручаны падчас правядзення абласных «Дажынак». Гутарка з кіраўніком пачалася з надзённага жыцця і перайшла ў перспектыву.**

**— Віктар Станіслававіч, якія самыя важныя дасягненні гаспадаркі вы б адзначылі за сёлетні год і за перыяд работы ў ААТ «Чарлёна»?**

— Гаспадарка ўмацавала свае вытворчыя пазіцыі па многіх кірунках. Мы добра спрацавалі на ўборцы зерневых і па паказчыках былі другімі ў раёне. А ў цэлым вызначаецца станоўчая дынаміка ў раслінаводстве. Калі ў 2021 годзе мы атрымалі 12 тысяч тон зерневых, то ў 2022-м — ужо 15 тысяч тон. Сёлета валавы збор павялічылі да 16,7 тысячы. Што датычыцца жывёлагадоўлі, у нас самыя высокія прыбаўленні вагі па адкорме.

**— Існуе стэрэатып, што самы напружаны час для аграрыяў — гэта пасяўная і ўборачная кампаніі. Ці так гэта на самай справе? Якія работы цяпер вядуцца на палях?**

— Можна сказаць, што пік палявых работ прайшоў, бо самымі напружанымі былі верасень і кастрычнік. Лістапад ужо лягчэй: па плане ідзе падняцце зябліва, мы праводзім работы па ўнясенні арганікі пад цукровыя буракі. Паралельна вядзецца ўборка цукровых буракоў. Хутка завяршым і гэтыя работы. Думаем, што каля 30 тысяч тон цукровых буракоў збяром. Ураджайнасць гэтай культуры нядрэнная — каля 700 цэнтнераў з гектара. Па кукурузе на сілас таксама нядрэнна спрацавалі: на пачатак лістапада ў траншэі закладзена 33 тысячы тон сіласу, зерня кукурузы намалочана 4,5 тысячы тон пры ўраджайнасці 90 цэнтнераў з гектара. У мінулым годзе мы атрымалі 21 тысячу тон зерневых з кукурузай і сёлета выходзім на такі ж паказчык.

**— Якім чынам удаецца трымаць планку?**

— Усё залежыць ад людзей, ад калектыву, ад таго, як выконваецца тэхналагічны працэс: як вядзецца ўнясенне ўгнаенняў, апрацоўка сродкамі абароны раслін і гэтак далей. Дарэчы, мы ўдасканальваемся і ў тэхнічным плане. Нядаўна набылі новы самаходны апрысквальнік на 32 метры, што на восем метраў больш за папярэдні. У вобласці ні ў кога няма падобнага агрэгата з такой шырынёй захопу. Гэта дазволіла павялічыць прадукцыйнасць работы ў некалькі разоў. Каб стала зручней працаваць, злучаем палі. Напрыклад, рапсавае поле цяпер у нас адзіным участкам у 400 гектараў. Каб працаваць на такіх вялікіх палях, набылі 12-метровую зерневую сеялку беларускага вытворцы LIDER-12000.

**— У раёне надзвычай роўныя палі, амаль да далягляду цягнуцца. Вашы землі таксама не выключэнне...**

— Мы гэтым скарысталіся. Раней у нас палі былі па 120–150 гектараў, цяпер сталі іх злучаць спецыяльна пад гэтыя шырокаахопныя агрэгаты. Такая сістэма надае тэмп рабоце, бо на кожным полі трэба правесці некалькі працэсаў ад пасеву да ўборкі. На злучаных палях з шырокаахопнымі агрэгатамі работа вядзецца больш паскорана, займае менш часу. Гэта таксама эканамічна выгадна. Не менш важнае значэнне мае культура земляробства. У першую чаргу, высакаякаснае выкананне ўсіх палявых работ у самыя спрыяльныя тэрміны. Важную ролю адыгрываюць правільны севазварот і рацыянальная апрацоўка глебы. Дзе культура земляробства высокая, там і ўраджайнасць адпаведная.



Намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Наталля БАГДАНЕЦ дэманструе жыллё для маладых спецыялістаў у аг. Глядавічы.

**— Я бачу, што вы пастаянна назіраеце за маніторам, тут у вас уся гаспадарка як на далоні. Наколькі такая сістэма відэаназірання дапамагае шукаць «болевыя» кропкі?**

— Манітор з'явіўся з 2021 года, як толькі я сюды прыйшоў на кіруючую пасаду. Гэта мая ініцыятыва. Там, дзе я дагэтуль працаваў намеснікам дырэктара, таксама ўводзіў такую сістэму відэаназірання. І перанёс сюды. Адразу не было магчымасці паставіць запланаваныя 35 камер. Сёлета, напрыклад, ідзе ўстаноўка сістэмы відэаназірання МТФ «Лунна», там ставім сем камер, а буйныя комплексы даўно ўкамплектаваныя.

Паступова павялічваю кропкі назірання, дабаўляюцца новыя відэакамеры. Цяпер гэтай сістэмай ахоплены ўсе тры ўчасткі. Гэта скіравана на тое, каб больш дысцыплінаваць работнікаў. Патрэбна, каб усе працэсы ішлі правільна паўсюль: на дойцы, у полі, на механічным двары.



Дырэктар гаспадаркі Віктар КУЛІСЕВІЧ дэманструе сістэму відэаназірання на аб'ектах.

Разам з тым «свежае» вока бачыць і тыя моманты, якія можна падцягнуць, скіраваць на эфектыўную работу. Таму не трэба «накручваць» кіламетры, каб даведацца, дзе, як і хто працуе. Хапае некалькіх хвілін, каб убачыць, што адбываецца на кожным важным аб'екце. Гэта відаць на маніторы ў кабінеце. Адным са станоўчых вынікаў такога маніторынгу стала паляпшэнне якасці малака. Яго больш сталі здаваць класам экстра.

**— Мы бачым, што да сельскагаспадарчай галіны, у прыватнасці да жывёлагадоўлі, цяпер даволі значная ўвага і з боку кіраўніка краіны, і галіновага міністэрства. Чаго ад вас чакаюць «зверху»?**

— Я думаю, ад нас чакаюць павелічэння аб'ёмаў вытворчасці, у тым ліку малака. На сённяшні дзень гэта самая прыбытковая і рэнтабельная галіна. Цяпер рэнтабельнасць малака складае 44 %. Гэтым варта займацца, бо цяпер, у зімовы сезон, можна ў асноўным разлічваць на даходы ад малака і мяса.

**— Атрымліваецца, што стаўка на комплексы сябе добра паказала?**

— Гэта перспектыўны кірунак, таму малочныя комплексы варта ўдасканальваць. Мы таксама ідзём па гэтаму шляху. Сёння вядзём рэканструкцыю на малочнатаварным комплексе «Глядавічы». Гэта дасць магчымасць пашырыць даільную залу і прыняць на дойку не 24 каровы, як было раней, а 36.

**— Я ведаю, што вы падчас абласных «Дажынак» асабіста атрымалі Падзяку ад Прэзідэнта за высокія паказчыкі ў працы. Каго яшчэ з вашай гаспадаркі ўзнагародзілі на свяце хлебаробаў?**

— Ад абласнога кіраўніцтва атрымалі граматы і ўзнагароды два нашы перадавікі. Гэта вадзіцель МАЗа Валерый Лукойка, які перавёз больш за пяць тысяч тон зерня, і камбайнер Юрый Сліўко. Яны сваёй працай уносяць значны ўклад у эканоміку гаспадаркі.



Аператары машыннага даення Алена АБУХОЎСКАЯ і Анжаліка БЯЛКО займаюцца даеннем кароў на МТК «Глядавічы».



Загадчык плодаагароднінасховішча «Грушаўка» Віталь САВІЦКІ каля сартавальнай лініі.

## «Было жаданне працаваць з тэхнікай»

### Максіму Багданцу ў 21 год даверылі новы трактар



Трактарыст-машыніст Максім БАГДАНЕЦ займаецца ўзгорваннем зябліва ў раёне вёскі Глядавічы.

Да палеткаў, дзе гэтымі днямі працуе малады трактарыст-машыніст, мы пад'ехалі ў суправаджэнні **Наталлі БАГДАНЕЦ, намесніка дырэктара ААТ «Чарлёна» па ідэалагічнай рабоце,** а па сумяшчальнасці — маці Максіма. Яна і расказала аб асноўных жыццёвых вехах свайго сына, пакуль той вяртаўся з другога канца неабсяжнага поля. Сёння тут ідзе работа па падняцці зябліва, гэта значыць поле пераворваецца з арганікай для падрыхтоўкі да новых пасеваў. Трактар Максіма быў ледзьве бачны, таму гэты час мы скарысталі, каб распытаць Наталлю Мікалаеўну аб сыне. Напрыклад, як яна ўспрыняла яго жаданне застацца працаваць на такім складаным участку работы. Аказалася, уся справа ў тым, што хлопец з дзяцінства марыў сесці за руль трактара. Таму пасля заканчэння школы Максім паступіў у Скідзельскі дзяржаўны каледж і прыйшоў у гаспадарку на практыку. І хоць ён меў толькі часовыя правы на ваджэнне, яму адразу даверылі трактар.

— Мабыць, добра сябе зарэкамендаваў, — разважае Наталля Мікалаеўна. — Пасля арміі іншых шляхоў сабе не шукаў, вярнуўся ў гаспадарку. У горад яго таксама не цягнула. Казаў мне, што і тут можна зарабіць. Вядома, я была не супраць таго, што сын застаецца ў нашай гаспадарцы. Кадры тут заўсёды патрэбныя, а ён заслужыў павагу сваёй працай. Каб быў дрэнным работнікам, наўрад ці яму даверылі б новы трактар.

Пакуль размаўлялі з маці, пад'ехаў і сам Максім. Цяпер можна было больш падрабязна распытаць яго аб тым, як яму працуецца. Пытанне, па праўдзе сказаць, хутчэй рытарычнае, бо адказ на яго звычайна кароткі. Вось і Максім ахарактарызаваў сваю работу проста: усё нармальна. Хоць зразумела, што нагрузка ў аграрыяў даволі значная. Работы вядуцца няспынна ад ранняй вясны да позняй восені. Вось і цяпер працоўны дзень завершыцца толькі ў 18 гадзін.

— Я працую ў гаспадарцы два гады, летась атрымаў новы трактар. Гэта было маё жаданне — працаваць з тэхнікай. Веды, якія атрымаў падчас вучобы, прымяняю на практыцы. Таксама дапамагаюць спецыялісты гаспадаркі, — расказвае Максім. — Сёлета вясной атрымаў новы трактар беларускай вытворчасці, ён зручны, магутны, з кандыцыянерам. Цяпер за мной замацаваны.

Ці шкадуе Максім, што застаўся працаваць у сельскай гаспадарцы? Кажа, што не шкадуе. Тут добрая заработная плата, што для моладзі даволі важны стымул. За месяц атрымліваецца больш за дзве тысячы рублёў, а падчас уборкі можна і тры тысячы зарабіць. Ёсць таксама прэміі, выхадныя дні. Праўда, у залежнасці ад сезона: бывае, што за ўраджай трэба змагацца, тады не да выхадных. Затое і зарплата адпаведная.

Пакуль Максім не збіраецца пакідаць свае родныя мясціны і гаспадарку. Больш за тое, марыць працаваць не толькі на трактары, але і на камбайне. «Галоўнае, каб гэты запал у рабоце ў яго не згас, — заўважае Наталля Багданец. — Бо кожная справа ўдаецца, калі ёсць жаданне працаваць і магчымасць ажыццявіць свае мары».

## Палявыя клопаты галоўнага агранома

### Чаму ў рабоце з кадрамі патрэбны асабісты кантакт

Здаецца, што позняя восень — гэта зацішша ў рабоце аграрыяў. Магчыма, доля праўды ў гэтым ёсць, пагаджаецца **галоўны агράном ААТ «Чарлёна» Іван ШАКРОТА.** Але толькі з першага погляду, бо тэхніка ў пастаянным руху. Напрыклад, цяпер на полі працуюць камбайны па ўборцы цукровых буракоў, трактары вядуць пад'ём зябліва, уносіцца арганіка. Вось і галоўны аграном пераязджае з поля на поле на сваім аўтамабілі. У мінулым годзе Іван атрымаў новы аўтамабіль, які таксама паставіў на экстрымальны рэжым паездак.

Наша размова з галоўным аграномам, дарэчы, якраз і адбылася падчас такой паездкі па полі. На ім нядаўна раслі цукровыя буракі, іх убралі, але разоры, вядома ж, засталіся. І так недзе з кіламетра паўтара, пакуль дабраліся да камбайна.

Чацвёрты год на ім працуе **Дзмітрый ВАЛЫНЕЦ.** Ён таксама звязаў свой лёс з сельскай гаспадаркай.



Трактарыст-машыніст Дзмітрый ВАЛЫНЕЦ займаецца ўборкай цукровых буракоў на полі паблізу вёскі Грушаўка.



Галоўны аграном Іван ШАКРОТА дэманструе ўраджай буракоў.

За рулём тэхнікі асвоіў амаль усе віды палявых работ: ад пасеваў да жніва. Цукровыя буракі завяршаюць сезон уборкі. Праўда, сезон даволі працяглы, бо менавіта пад цукровымі караняплодамі заняты самыя вялікія плошчы гаспадаркі. І ўраджайнасць іх адна з самых высокіх ва ўсім Мастоўскім раёне. Дзмітрый, напрыклад, за працоўны дзень убірае да 10 гектараў плошчы. Тут варта паспець да маразоў. Каб быць упэўненым у якаснай рабоце, галоўны аграном гатовы даехаць да кожнага кутка поля.

— Мне зручней праехаць, сваімі вачыма ўбачыць, як вядзецца работа, асабіста паразмаўляць з механізатарам. У сельскай гаспадарцы не менш важны кантакт, хоць кожны ведае свой участак працы, — упэўнены Іван Шакрота. — У кожнай справе ўвага кіраўніка вельмі важная, тым больш калі бываюць нейкія няштатныя сітуацыі. Не варта, каб чалавек адчуваў сябе пакінутым без увагі. Калі нейкая паломка адбылася, трэба аказаць дапамогу, бо гэта агульная справа, наш агульны ўраджай.

Што датычыцца ўдзелу галоўнага агранома, ён, па-першае, павінен падабраць адпаведныя палі. Бо не ўсе палі прыдатныя пад тыя ці іншыя культуры, напрыклад, пад цукровыя буракі трэба аддаць найбольш пладародныя палеткі. Зноў жа, насенне, сродкі абароны раслін...

— Кожны год з'яўляецца новае насенне, спрабуем на сваіх землях, калі што паказала добры вынік, укараняем масава, — заўважае галоўны спецыяліст.

У сельгаспадарцы галоўнага агранома поўнасцю падтрымліваюць. За апошнія тры гады значна палепшылася тэхнічная база. І гэта вельмі важна, кажа Іван Шакрота, бо з тэхнічным забеспячэннем цесна звязаны лёс будучага ўраджая.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

УНП 500126066